НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ

# СЛОВА ВЫБІТНАГА ЗЯМЛЯКА




У сакавіку выйшла з друку вельмі цікавая і каштоўная кніга “Слова і кніга Прынёмання”. Яе аўтар — вядомы гарадзенскі культуролаг, літаратуразнаўца і краязнаўца, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч.

І хоць новая кніга Аляксея Міхайлавіча мае падзагаловак: “Зборнік навуковых артыкулаў”, разлічана выданне на самую шырокую аўдыторыю чытачоў, сапраўдных патрыётаў, людзей неабыякавых да сваёй Айчыны, яе культурнай спадчыны. Гэта выданне прыцягне ўвагу ўсіх, чый лёс звязаны з Прынёманскім краем, з яго багатымі літаратурнымі традыцыямі і само з’яўляецца годным працягам гэтых традыцый. Унікальнасць новай кнігі заключаецца ў тым, што прафесар А.М.Пяткевіч прыводзіць прыклады Гродзеншчыны літаратурнай як культурнай з'явы не толькі нацыянальнага, але і еўрапейскага маштабу, у імёнах, падзеях і асобах ад старадаўніх часоў, калі друку яшчэ не існавала, да нашых дзён.

“Кнігу складаюць матэрыялы пра культуру Гродзеншчыны. Прасочваецца гісторыя рукапіснай творчасці, друку, літаратуры, музычнага жыцця гэтага рэгіёну. Разглядаецца дзейнасць некаторых асоб і ўстаноў. Дадаецца яшчэ аўтабіяграфічны нарыс”, — гаворыцца ў анатацыі. Некаторыя артыкулы аздоблены каляровымі і архіўнымі фотаілюстрацыямі. Рэцэнзент: кандыдат культуралогіі, дацэнт Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта П.К.Банцэвіч.

Кніга Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча “Слова і кніга Прынёмання” выйшла ў гродзенскім выдавецтве “ЮрСаПрынт” накладам 120 асобнікаў; яна з’явілася напярэдадні 85-годдзя аўтара.

ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА